ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
13 СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 35 (1448)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

СТУДЭНЦКАЯ НАВУКОВАЯ

канферэнцыя на тэму «Гераізм савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны», прысвечаная 40-годдзю Перамогі над фашысцкай Германіяй, прайшла на II курсе механіка-матэматычнага факультэта.

Адкрыў канферэнцыю дацэнт кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў Р. А. Малюковіч. Затым да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуўся Герой Савецкага Саюза, прафесар Д. П. Жмуроўскі.

З вялікай цікавасцю слухалі прысутныя даклады «Гераізм абаронцаў Брэсцкай крэпасці», «Партызанская і падпольная барацьба беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Партызанскі рух на Барысаўшчыне ў гады вайны» і іншыя, якія падрыхтавалі студэнты Г. Зайцава, І. Ждановіч, А. Бабук, І. Блінаў.

У заключэнне аб гераізме савецкіх воінаў расказаў палкоўнік у адстаўцы, удзельнік абароны Масквы і Курскай бітвы А. С. Мізрахі.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

СУМЕСНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

навуковых семінараў прайшло на механіка-матэматычным факультэце і факультэце прыкладной матэматыкі. Яно прысвячалася памяці дацэнта Мікалая Іванавіча Брыша, заснавальніка школы па ўраўненнях з прыватнымі вытворнымі ў Беларусі.

У. УЛАДЗІМІРАЎ.

УНІВЕРСІТЭТ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

запрашае выкладчыкаў і студэнтаў на канцэрты-лекцыі. У іх прымаюць удзел Мінскі камерны аркестр, салісты Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР, Беларускай дзяржаўнай філармоніі, вядучыя салісты Масквы, Ленінграда. Вядзе праграму музыказнаўца Міхаіл Казінік. Першы канцэрт «Музыка 300 гадоў назад» (па творах італьянскага, нямецкага, французскага, англійскага барока) адбудзецца 18 снежня 1984 года. На канцэрт «Да таямніц творчасці» (Бах, Моцарт) запрашаем аматараў 14 лютага 1985 года, а 11 красавіка 1985 года адбудзецца канцэрт «Легенда і праўда аб Антоніа Вівальдзі».

А. ЗАКІРАЎ,
дырэктар Мінскага камернага аркестра.

● СУСТРЭЧА З ГЕРОЕМ КОСМАСУ ●

У. В. Кавалёнак:

«ПОСПЕХАЎ У ВУЧОБЕ!»

Яна заўсёды жыве ў чалавекам — мара аб небе, мара аб незнаёмых галактыках, далёкіх планетах, сустрэчах з братамі па розуму... Таму, вядома, людзей, якія пабачылі зямлю з той, не кожнаму даступнай вышыні, слухаць цікава і карысна...

ЗГАДЗІЦЕСЯ, не часта такое бывае — у госці да вас прыязджае касманаўт. Адно — прачытаць у часопісе або паслухаць па радыё інфармацыю аб асваенні космасу, і зусім іншае — спытаць тое, што цябе хвалюе, у чалавека, непасрэднага ўдзельніка гэтай грандыёзнай справы.

І таму, здавалася, пытанням двойчы Герою Савецкага Саюза, лётчыку-касманаўту СССР У. В. Кавалёнку на сустрэчы са студэнтамі БДУ імя У. І. Леніна не будзе канца. Самым розным.

— Як вырошчваць крышталі ў космасе?

— Ці праўда, што палёты ўплываюць на зямное надвор'е?

— Ці можна фарміраваць экіпаж з адных жанчын?

— Прыблізны час палёту да іншых планет сонечнай сістэмы?

— З кім бы Вы паляцелі ў космас?

А сапраўды, што ведаем мы аб працы касманаўтаў? Успамінаюцца трансляцыі з арбітальнай станцыі: гэтыя людзі заўсёды бадзёрыя, падцягнутыя, абавязкова — гумар, усмешкі на тварах. І не-не, ды падумаецца часам, што космас — гэта нешта накшталт курорта...

— Ці так, Уладзімір Васільевіч?

— Работы, цяжкай, манатоннай работы, на караблі шмат. Напрыклад, мне давялося амаль штодня чатыры месяцы рэгулярна ўглядацца ў люстэрка прылады, каб адказаць на здавалася б простае пытанне. Дарэчы, як кажуць, эканамічны эфект гэтага назірання — 800 мільёнаў рублёў. Космас тым цікавы і карысны, што дае аддачу за працу, плаціць спаўна. І не толькі з пункту гледжання навукі, а і ў самым прамым сэнсе — рублём.

Атрымаўшы чарговую серыю запісак з залы, Уладзімір Васільевіч Кавалёнак працягвае:

— Цяжкасці пачынаюцца яшчэ пры падрыхтоўцы да палёту. Дарэчы, гэта наогул адзін з самых адказных і напружаных момантаў: рэгулярныя трэніроўкі, тэарэтычныя заняткі. Аб тым, які ўзровень ведаў патрабуецца ад кожнага, можна меркаваць хаця б па тым, што вінен быць у касманаўта, мяркуйце самі: перад палётам неабходна здаць да 80 экзаменаў па самых розных дысцыплінах. Пры гэтым можна атрымаць не больш за чатыры чацвёркі, інакш не будзеш залічаны ў састаў экіпажа.

Пераканаўча і неяк зусім будзённа гаварыў Уладзімір Васільевіч аб «касмічных» планах і праблемах, што зараз стаяць перад навукай. З яго вуснаў проста і ўпэўнена прагучалі словы аб тым, што, магчыма, наша пакаленне стане сведкам экспедыцыі на Марс, асваення іншых планет Сонечнай сістэмы. Зусім недалёка той час, калі на Месяцы ўзнікнуць касмічныя базы і стартавыя пляцоўкі для караблёў.

Сустрэча закончылася даволі позна. Мінск запальваў агні — маленькія зоркі вокнаў кватэр. Нібы сігналы ў далёкі і агромністы Сусвет. І як бы адказваючы: «Мы чуем вас», успыхвалі ліхтарыкамі і распускалі пялёсткі зоркі — высокая мара людзей.

На развітанне У. В. Кавалёнак пажадаў: **«ПОСПЕХАЎ У ВУЧОБЕ. КАБ, ПРАВУЧЫЎШЫСЯ ПЯЦЬ ГАДОЎ, ВЫ ПАКІДАЛІ ГЭТУЮ НАВУЧАЛЬНУЮ ЎСТАНОВУ З АДЧУВАННЕМ ВЫКАНАНАГА ДОЎГУ, З ЯКІМ МЫ ПАКІДАЕМ КАРАБЕЛЬ ПАСЛЯ ВЫКАНАННЯ ЗАДАННЯ».**

Запісала
А. МАСЛА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

НА ЗДЫМКУ: з героем космасу гутараць рэктар, акадэмік АН БССР Л. І. КІСЯЛЕЎСКІ, Герой Савецкага Саюза Д. П. ЖМУРОЎСКІ і М. Я. ЗАЙЦАЎ.

Фота А. Валошына.

● ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА ●

І настрой аптымістычны

Гутарка з сакратаром камітэта камсамола хімічнага факультэта Дзмітрыем Орлікам была кароткай, але дзелавой. Наш субяседнік— выдатнік вучобы, студэнт 4-га курса групы неарганікі паўправаднікоў. Група, у якой займаецца Дзіма, —адна з лепшых на факультэце.

— Дзмітрый, у вашай групе займаюцца ў асноўным юнакі. Сярод іх нямала выдатнікаў. Чым гэта тлумачыцца?

— Так, у групе ўсяго 11 студэнтаў, з іх 5 выдатнікаў. Акрамя таго, яны актыўна займаюцца навуковай працай, знаходзяць час для грамадскай работы. Напрыклад, Дзмітрый Рудкевіч — камсорг, Аляксей Селянінаў паспяхова выконвае абавязкі старасты, Сяргей Кудраўцаў — намеснік старшыні студсавета інтэрната № 4. Самае галоўнае — гэта адказнасць за даручаную справу. У большасці сваёй нашы студэнты не шкаляры, а дарослыя людзі з цвёрдымі поглядамі на жыццё, з добрым разуменнем правоў і абавязкаў.

Былі і ў нас цяжкасці. Двое студэнтаў з групы ніяк не маглі ўзяцца за вучобу як трэба. Выправіць становішча дапамагло ўвядзенне калектыўнай адказнасці. І як вынік — група здала летнюю сесію без запазычанасцей.

— Ты напомніў аб калектыўнай адказнасці. Якім чынам яна дапамагае ў вучобе?

— Калі студэнт ведае, што за яго ўчынкі адказвае не толькі ён, але і яго таварышы, а ў першую чаргу староста і камсорг, то да сваіх дзеянняў ён пачынае падыходзіць з больш прынцыповых пазіцый. Няёмка падводзіць сяброў.

— Хутка сесія. Яна ў вас вельмі складаная. Здаць сем экзаменаў — цяжка, акрамя таго, яны нялёгкія, ды і дыпломная праца не за гарамі. Ці ёсць надзея, што група і цяпер не здасць пазіцый?

— У нас ужо даўно вядзецца актыўная падрыхтоўка да сесіі. Група прыняла калектыўныя абавязацельствы: здаць сесію без запазычанасцей і атрымаць не больш за 10 здавальняючых адзнак. Нашы студэнты слоў на вецер не кідаюць.

— Якім чынам думаеце дасягнуць такіх паказнікаў?

— Па-першае, спадзявацца на гэта дае падставы бягучая паспяховасць. А па-другое, у нас сфарміравана група для кансультацый па найбольш складаных прадметах, а за менш падрыхтаванымі студэнтамі замацаваны выдатнікі вучобы.

Наогул, за вучобу патрэбна брацца з першага курса. Мы, старшакурснікі, робім усё магчымае для таго, каб сесія для цяперашніх першакурснікаў прайшла паспяхова. Пачаў дзейнічаць лекторый «Вучымся вучыцца». Шостага снежня была праведзена першая лекцыя, дзе на розныя хвалюючыя пытанні першакурснікі атрымалі адказ ад студэнткі 3-га курса, члена камітэта камсамола Ірыны Лук'яненка. Думаю, што студэнты хімфака не здадуць пазіцыі ў вучобе, таму і настрой у нас аптымістычны.

І. РУСЕЦКАЯ,
К. ЧАПЛЯ,
студэнткі факультэта журналістыкі.

УДАСКАНАЛЬВАЦЬ КАНТРОЛЬ

Выконваючы рашэнні XXVI з'езда КПСС і наступных Пленумаў ЦК КПСС, партыйная арганізацыя БДУ імя У. І. Леніна накіроўвае свае намаганні на павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукі і культуры. Гэтай галоўнай мэце падпарадкавана рашэнне задач па планамернаму ўдасканаленню прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў і прафесійна-кваліфікацыйнай структуры прафесарска-выкладчыцкага, вучэбна-дапаможнага і адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу, па ўдасканаленню вучэбнага працэсу, падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў і развіццю навукова-даследчай дзейнасці, павышэнню эфектыўнасці ідэалагічнай і выхаваўчай работы. Важную ролю ў ажыццяўленні пастаўленых задач адыгрывае выбарны актыў універсітэта: партком, бюро пярвічных партарганізацый, партгрупоргі, а таксама кантрольныя органы пры парткоме — КНК, парткамісія, камісіі кантролю за дзейнасцю адміністрацыі, групы народнага кантролю ў пярвічных партарганізацыях, а таксама «Камсамольскі пражэктар».

ПАЛАЖЭННІ і вывады, што ўтрымліваюцца ў прамове К. У. Чарненкі на Усесаюзнай нарадзе народных кантралёраў, з'яўляюцца канкрэтнай праграмай работы на доўгачасовую перспектыву не толькі для ГНК, КНК, але і для ўсіх органаў кантролю.

Прамова К. У. Чарненкі прасякнута вялікім клопатам аб неабходнасці ўмацавання дзяржаўнай, працоўнай і выканаўчай дысцыпліны. Гэтае пытанне заўсёды з'яўлялася адным з асноўных у рабоце кантрольных органаў універсітэта.

Разам з тым, як паказаў шэраг праверак, праведзеных органамі кантролю, наглядаецца нізкае наведванне заняткаў па грамадскіх дысцыплінах на механіка-матэматычным, геаграфічным, фізічным, філалагічным факультэтах, ёсць факты парушэння працоўнай дысцыпліны сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў, вучэбна-дапаможнага персаналу.

Заклапочанасць выклікае невысокая выніковасць мер, якія прымаюцца супраць злоўжывання алкаголем. Неабходна зрабіць усё, што залежыць ад органаў кантролю, каб барацьба з п'янствам стала эфектыўнай, каб яна не абмяжоўвалася фармальнымі мерамі. Думаем, што апублікаваны ў газеце «Беларускі універсітэт» фельетон В. Чарняўскага «Вяселлі і пахмеллі» адыграе таксама станоўчую ролю ў барацьбе з п'янствам, і тым таварышам, прозвішчы якіх у ім прагучалі, будзе дадзена прынцыповая ацэнка ў калектывах.

Рашэнне пастаўленых задач па ўзмацненню кантролю цалкам залежыць ад умення арганізаваць работу камітэта народнага кантролю, груп і пастоў, надаць ёй канкрэтнасць і мэтанакіраванасць. У гэтай сувязі нельга не сказаць аб увазе, якая аказваецца органам кантролю з боку парткома, партыйных пярвічных арганізацый, якія пастаянна накіроўваюць практычную дзейнасць КНК і яго груп. Аднак хацелася б, каб гэта дапамога была яшчэ больш адчувальнай, асабліва ў такіх падраздзяленнях, як філфак, АГЧ, падрыхтоўчы факультэт.

Патрэбна адзначыць, што органы кантролю пакуль яшчэ не забяспечваюць цалкам выканання ленінскага патрабавання аб арганічным адзінстве праверкі, папярэджання і выпраўлення недахопаў. Праверкі, якія выяўляюць пралікі і недахопы, па выніках якіх не прымаюцца дзейсныя меры, не спаганяецца строга з парушальнікаў дысцыпліны і законнасці, не могуць даць жаданых вынікаў. Пры такім падыходзе кантроль ператвараецца ў фармальнасць.

Праверкі не павінны з'яўляцца самамэтай. Эфектыўнасць работы кантрольных органаў вызначаецца не колькасцю праверак і прынятых рашэнняў, а тым, наколькі змянілася, палепшылася справа. Патрэбна ўзяць за правіла, каб кожная праверка, калі мы яе праводзім, давала канкрэтны вынік, прыводзіла да паляпшэння справы. Неабходна засяродзіць увагу на асноўных пытаннях, ад якіх залежаць эфектыўнасць і якасць работы універсітэта.

Прафілактычная работа — адна з асаблівасцей дзейнасці кантралёраў. Важна папярэдзіць кіраўнікоў ад памылак і пралікаў. На жаль, часам кантралёры паяўляюцца тады, калі выправіць што-небудзь немагчыма: застаецца толькі пакаранне, хаця заслужанае, але яго можна было пазбегнуць. Статыстыка разгледжання персанальных спраў партыйнай камісіяй з'яўляецца шматзначнай. Так, у 1981 годзе было разгледжана 10 персанальных спраў, у 1982 — 12, у 1983 — 6, за 10 месяцаў гэтага года — 10. Усяго — 38, з іх 12 чалавек выключаны з партыі, у тым ліку за парушэнні партыйнай, дзяржаўнай і працоўнай дысцыпліны — 9 чалавек, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў — 1, за амаральныя паводзіны — 1, антыпартыйныя паводзіны — 1.

У той жа час нельга не бачыць і таго, што органы кантролю, сутыкаючыся з парушэннямі, а часам і злоўжываннямі, не праяўляюць патрэбнай вастрыні і баявітасці, памяркоўна адносяцца да тых, хто вінаваты.

Выклікае заклапочанасць і той факт, што толькі за 10 месяцаў гэтага года парткому па рэкамендацыі парткамісіі 5 разоў даводзілася касаваць рашэнні пярвічных партыйных арганізацый, узмацняючы партыйныя спагнанні на журфаку, юрфаку і філфаку, указваць у пастановах на неаб'ектыўнасць, адсутнасць прынцыповасці ў падыходзе да разбору персанальных спраў.

Патрэбна таксама адзначыць, што шэраг недахопаў, выяўленых у час праверак, якія датычацца адміністрацыйна-гаспадарчай часткі (гаража, інтэрнатаў, сталовай) да гэтага часу не выпраўлены. Дзейнасць кантралёраў яшчэ не заўсёды канцэнтруецца на пытаннях, ад вырашэння якіх залежыць павышэнне ўзроўню работы адміністрацыйна-гаспадарчай часткі.

У апошні час умацавалася ўзаемадзеянне ў рабоце органаў народнага кантролю з партыйнай камісіяй, камісіямі кантролю за дзейнасцю адміністрацыі. Так, на працягу 1983-84 гадоў сумесна разглядаліся пытанні аб выкарыстанні абсталявання на фізічным факультэце, аб рабоце вучэбнага аддзела, аб стане партыйнай дысцыпліны на механіка-матэматычным факультэце і інш. Складзены комплексны план работы ўсіх кантрольных органаў. Такое аб'яднанне намаганняў не толькі расшырае грамадскую базу кантролю, але дазваляе ажыццяўляць яго больш глыбока і вынікова, пазбягаць дубліравання. Важна і далей паляпшаць каардынацыю кантрольнай дзейнасці ўсіх органаў кантролю універсітэта.

Думаецца, што органы кантролю будуць актыўнымі памочнікамі партыйнай арганізацыі ў справе ажыццяўлення рашэнняў XXVI з'езда КПСС, наступных Пленумаў ЦК КПСС, у справе паспяховай падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукі і культуры.

Л. ПАЎЛОВІЧ,
намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце.

● НАШЫ ЮБІЛЯРЫ ●

АЎТАРЫТЭТ ТАЛЕНТУ

Доктару тэхнічных навук, прафесару, заслужанаму дзеячу навукі і тэхнікі БССР, загадчыку кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі БДУ імя У. І. Леніна Станіславу Станіслававічу ШУШКЕВІЧУ спаўняецца 50 гадоў.

У КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА ёсць свая мара. Яна загартоўваецца ў працы, кліча наперад, вучыць настойлівасці. Аднак у адных яна адплывае светлым воблакам, а другія, нягледзячы на перашкоды, крутыя павароты лёсу, няўдачы і паражэнні, ляцяць на яе крылах, адзначаючы свой шлях каштоўнымі здзяйсненнямі.

Прафесару С. С. Шушкевічу пашчасціла ажыццявіць сваю мару. Ён стаў педагогам і вучоным. Наўрад ці можна знайсці больш каштоўнае па зместу спалучэнне слоў!

Яго стыль навучання напоўнены зместам пастаяннага набліжэння да студэнта, уключэння яго ў рытм універсітэцкага жыцця, выхавання неабходнасці пастаяннай і напружанай працы. Гэта той шлях, які вядзе да поспеху, вынікам яго з'яўляецца высокакваліфікаваны спецыяліст і інтэлектуальная асоба.

Гэты вопыт спасцігаўся тэарэтычна і практычна. Студэнт С. Шушкевіч пяць гадоў вучобы ва універсітэце выкладаў фізіку і электратэхніку ў школах №№ 12 і 13 г. Мінска. А ў час вучобы ў аспірантуры працаваў выкладчыкам фізікі ў Інстытуце народнай гаспадаркі.

Шушкевіч-педагог сфарміраваўся на аснове перадавога вопыту савецкай вышэйшай школы. Зараз ён сам з'яўляецца лепшым і вопытнейшым яго прадстаўніком. Гэта пацвярджаюць многія пакаленні выпускнікоў універсітэта, якія прайшлі школу Станіслава Станіслававіча.

Не кожнаму настаўніку пішуць пісьмы вучні і праз пяць, і праз дваццаць гадоў. Атрымліваюць іх толькі тыя, хто дапамог адкрыць свой шлях, стаў настаўнікам не толькі ў час лекцый, але і на ўсё жыццё.

Аб гэтым пішуць вучні свайму настаўніку з розных куткоў краіны. Ідуць пісьмы і з-за мяжы. В'етнамец, выпускнік БДУ, кандыдат фізіка-матэматычных навук, які абараніў дысертацыю пад кіраўніцтвам прафесара Шушкевіча, дацэнт Ханойскага політэхнічнага інстытута, піша ў Мінск, што ён удзячны лёсу — яго настаўнікам быў Станіслаў Станіслававіч. У прыватным пісьме — сардэчная ўдзячнасць вучонаму за дапамогу ў развіцці фізічнай навукі сацыялістычнага В'етнама. Высокая і заслужаная ацэнка.

Прафесар С. С. Шушкевіч вучыць моладзь працаваць. Адказна, таму што праца — катэгорыя дзяржаўная, рэзультатыўна, таму што гэта рух наперад, і самааддана — у гэтым аб'ядноўваюцца любоў да сваёй справы і Радзімы.

Яго работа не падзяляецца на вытворчую і грамадскую. Прафесар, член парткома універсітэта... Можна назваць дзесятак адказных даручэнняў. Аднолькава сабрана рыхтуецца ён да выступлення на абароне дысертацыі, перад рабочымі, на партыйным сходзе. У сціслым, а для творчага чалавека заўсёды кароткім дні першаступеннае месца адводзіцца зносінам з людзьмі. Для сяброў і калег, для тых, хто шукае ў навуцы сваю пазіцыю і сваё месца, у прафесара заўсёды знойдзецца і час, і добрая парада.

Мэтанакіраванасць вучонага, уменне весці справу шырокім наступленнем, уключаючы на кожным новым этапе ўсё большую колькасць людзей, патрабуе дынамічнасці, сутыкнення думак, пераадолення канфліктаў, памылковых меркаванняў.

У характары С. С. Шушкевіча—парывістасць, смеласць і рашучасць, а гэтыя рысы імпануюць моладзі. Таму адна з большых кафедраў ва універсітэце — ядзернай фізікі — маладая ў сваім асноўным саставе. Маладыя і вучні прафесара.

Пад яго кіраўніцтвам 23 чалавекі сталі кандыдатамі навук. Фактычна ў вучоныя выйшла студэнцкая вучэбная група фізічнага факультэта ў поўным саставе. Яна рознаўзроставая і шматнацыянальная. Падрыхтоўка вучоных-фізікаў — адна з вялікіх удач С. С. Шушкевіча. У розных гарадах нашай краіны і за мяжой вучні ажыццяўляюць яго ідэі і развіваюць іх. Гэта школа, якая актыўна дзейнічае і пастаянна папаўняецца.

Цяжка вызначыць яе патэнцыял у лічбах і фактах. Але відавочна перспектыўнасць — яна дзейнічае на адным з напрамкаў сучаснай фізікі, садзейнічае інтэнсіфікацыі вытворчасці.

Душэўная празорлівасць і ўлюбёнасць у сваю справу, разуменне праблем і пранікненне ў іх дапамагаюць С. С. Шушкевічу падтрымліваць на кафедры імкненне да дынамічнай выніковасці. Гэта згуртаваны і працаздольны калектыў вучоных, які падтрымлівае цесныя сувязі з навуковымі падраздзяленнямі рэспублікі, а таксама з многімі навуковымі цэнтрамі краіны.

Калектыўная праца кафедры праяўляецца ва ўсіх сферах жыцця: вучэбнай, навуковай, грамадскай. Іх захапляе настойлівая праца навуковага кіраўніка, які напісаў каля 160 навуковых прац і атрымаў каля 30 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходствы. Кафедра ядзернай фізікі таму і стала адным з вядучых навуковых фарміраванняў, аказвае відавочны ўплыў на агульнае развіццё універсітэта. Тэматыка яе навуковых распрацовак уваходзіць у разрад важнейшых даследаванняў рэспублікі і краіны.

У калектыве кафедры выспела першае адкрыццё ў сістэме вышэйшай школы рэспублікі, 10 маладых вучоных па тэматыцы кафедры ўдастоены прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Прылады кафедры неаднаразова экспанаваліся на выстаўках дасягненняў народнай гаспадаркі СССР і БССР, высокую ацэнку спецыялістаў атрымалі вучэбныя і метадычныя дапаможнікі. З 1979 года дзейнічае агульнасаюзная праграма па асновах радыёэлектронікі для універсітэтаў, створаная пад кіраўніцтвам С. С. Шушкевіча. Ім разам з дацэнтам М. К. Яфімчыкам выдадзены падручнік, які адпавядае гэтай праграме, па якому вучацца студэнты універсітэтаў краіны.

Пад яго кіраўніцтвам упершыню ў нашай краіне былі распрацаваны аптычныя сістэмы перадачы інфармацыі, якія не ўступаюць лепшым сусветным узорам і дазваляюць дасягнуць высокіх тэмпаў перадачы даных. Ажыццёўлены поўны перагляд метадаў пабудовы электронных кампанентаў радыёспектраметрычнай апаратуры, што прывяло да стварэння прынцыпова новага класа электронных вымяральных прылад. Створана серыя унікальнай апаратуры для збору і апрацоўкі інфармацыі аб стане элементаў біясферы.

Разам са сваімі вучнямі ён стварыў шэраг эфектыўных метадаў і сродкаў для аўтаматызацыі аптычных вымярэнняў, якія дазволілі не толькі рэзка павысіць прадукцыйнасць працы, але і стварыць перадумовы для пастаноўкі прынцыпова новых работ.

Лаканічны пералік праблем навуковага пошуку не дае поўнага ўяўлення аб іх каштоўнасці. Прылады, распрацаваныя пад кіраўніцтвам С. С. Шушкевіча, выпускаюцца серыйна на буйнейшых прадпрыемствах з дзяржаўным Знакам якасці. Яны дазволілі распрацаваць і шырока ўкараніць радыёспектраскапічныя метады не толькі ў практыку навукова-даследчых устаноў, але і непасрэдна ў вытворчасць, дзе іх выкарыстанне раней было абмежаваным або лічылася немагчымым. Яны выкарыстоўваюцца ў развіцці аграпрамысловага комплексу, атамнай энергетыкі, авіяцыі, металургіі і іншых галін народнай гаспадаркі.

Гэтыя прылады працуюць у высокагор'і, савецкіх арктычных экспедыцыях. З іх дапамогай атрыманы прынцыпова новыя унікальныя навуковыя матэрыялы са значным эканамічным эфектам. Дзякуючы распрацоўкам С. С. Шушкевіча сфарміраваны комплекс навуковых і вытворчых малагабарытных спектрометраў агульнага і спецыяльнага прызначэння, які пераўзыходзіць сусветны ўзровень.

Работы С. С. Шушкевіча і яго паслядоўнікаў настолькі значныя, што комплекс даследаванняў па стварэнню, шырокаму ўкараненню малагабарытнай радыёспектрычнай апаратуры і радыёспектраметрычных метадаў у народную гаспадарку вылучаны на прэмію Савета Міністраў СССР. Гэта высокая ацэнка працы вучоных.

На кафедры ядзернай фізікі назапашаны вялікі патэнцыял для далейшага развіцця вучэбна-выхаваўчай і навукова-даследчай работы, які ўзрастае з кожным годам. Арганізатарам напружанай работы, эфектыўнасць якой павялічваецца, яе ідэйным натхніцелем з'яўляецца камуніст С. С. Шушкевіч. Яго талент педагога, вучонага, арганізатара навукі, які знаходзіцца ў самым росквіце, сілай сваёй захапляе моладзь і накіроўвае яе на напружаную працу ў імя Радзімы.

А. СЛУКА,
лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

З ПАВАГАЙ ДА ПІСЬМЕННІКА

КАМУ ПЕРШАМУ прыйшла гэта думка — сказаць зараз немагчыма. Але і кіраўнік, і стараста, і члены гуртка на кафедры гісторыі БССР у адзін голас вырашылі, што іх калектыў павінен насіць імя Уладзіміра Караткевіча. Гэта не выпадкова. Гістарычная тэма займала ў творчасці пісьменніка асноўнае месца, а многія студэнты захапіліся гісторыяй свайго народа, сваёй Радзімы дзякуючы такім раманам, як «Каласы пад сярпом тваім», «Чорны замак Альшанскі», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» і інш.

У госці да студэнтаў на ўрачысты вечар прыйшлі літаратары і навукоўцы, якія добра ведалі Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча. Пра яго жыццёвы і творчы шлях змястоўна і падрабязна, з уласцівым яму гумарам расказаў вядомы літаратуразнаўца Адам Мальдзіс. З яго слоў гурткоўцам цікава было даведацца, што ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» запланавана выданне дзесяцітомнага збору твораў «пясняра зямлі з найменнем Беларусь».

Расказ папярэдняга прамоўцы дапоўнілі пісьменнік Вячаслаў Адамчык, археолаг Міхась Чарняўскі, паэт Сяргей Панізнік. Апошні прачытаў свае вершы, прысвечаныя Уладзіміру Караткевічу.



НА ЗДЫМКАХ: Для Ларысы Барушка У. Караткевіч — любімы пісьменнік; выступае Адам Мальдзіс; уважліва слухае Аляксей Сухарукаў, член гуртка; у заключэнне сустрэчы студэнт гістарычнага факультэта Алесь Камоцкі выканаў некалькі сваіх песень на словы Уладзіміра Караткевіча.

Тэкст і фота В. Грамовіча.

ЛЮДЗІ → ФЕЛЬЕТОН ← „З АБСТАВІНАМІ"

СТУДЭНТЫ — так было раней — падзяляліся на дзве часткі: адну з іх складалі старанныя і руплівыя, другую — непапраўныя лайдакі. Так было. Гэты пункт гледжання на студэнцтва, нарадзіўшыся на другі ж дзень пасля адкрыцця першага ў свеце універсітэта, з цягам часу прыняў стан непрыдатнасці і да нашых дзён не захаваўся. Таму, паважаны чытач, не спяшайся, калі разглядаецца пытанне, чаму студэнт Н. зноў у чарговай сесіі нахапаў незалікаў ды цягае за сабой паўтузіна «хвастоў», устаць і сказаць яму ў вочы: «Вы, студэнт Н., лайдак, і больш нічога». Дзеля ўсяго святога заклікаю цябе не рабіць гэтага. Бо пакрыўдзіш чалавека...

Зараз растлумачу. Справа ў тым, што студэнт Н. не прагульшчык, не нікчэмны ў будучым спецыяліст, карацей, не лайдак чыстай вады, як прынята казаць, а чалавек... з абставінамі.

Абставін многа. Ад прымітыўных: «Аўтобуса не было» да такіх, што ў самога дух захопіць. Напрыклад: «Не з'явіўся на калёквіум, таму што быў сведкай прыбыцця на зямлю інапланецян». І вы што, сур'ёзна думаеце, што такую падзею нельга падмацаваць даведкай? Вы наіўны чалавек. Студэнт здольны пацвердзіць даведкай з пячаткай усё, што патрэбна пацвердзіць. Бо ён — чалавек «з абставінамі».

Каб не выглядаць галаслоўным, назаву прозвішча Наталлі Ліпскай, студэнткі 3-га курса механіка-матэматычнага факультэта. Спасылаючыся на шматлікія хваробы і падмацоўваючы доказы адпаведнымі паперамі, яна такім чынам ужо

на другім курсе зацвердзіла сваё права не наведваць лекцыі, а пасля і нагул не здавала экзамены летняй сесіі. Тым не менш Н. Ліпская пераканала дэканат перавесці яе ўмоўна на трэці курс. Тут гісторыя пачалася спачатку. Аж пакуль супрацоўнікі дэканата больш уважліва не пацікавіліся даведкамі з паліклінік, якія стосамі прыносіла Н. Ліпская. Усе яны аказаліся проста «ліпай». А такі чалавек быў, салідны, «з абставінамі».

У студэнткі фізічнага факультэта пяцікурсніцы Ганны Буяк абставін не шмат. Дакладней кажучы, адна — «вялікая грамадская работа». Цяжка сказаць, наколькі ёй шанцуе на ніве гэтай дзейнасці, а вось «хвост» па замежнай мове надзейна прымацаваўся да яе прозвішча і на будучае таксама абяцае не зважаць увагі ні на якія «прычыны» занятай асобы.

Дарэчы, не лепшыя ў гэтых адносінах «хвасты» дасталіся студэнткам мехмата Вользе Ветравай і Таццяне Ладанавай.

Няма такога правіла, каб з яго не зрабілі выключэння. Баіменна настаўніцкая дзейнасць і прывабіла хлопцаў на філфак. Зараз яны дабываюць там

дай што гэта заканамернасць не абмінула і людзей «з абставінамі». Бо фізфакаўцы П. Іваноў (4-ы курс) і В. Васільеў (5-ы курс) так і не могуць назваць тых прычын, якія хранічна не дазваляюць ім вучыцца не тое што добра, а хаця б пасрэдна. І на сённяшні дзень у іх як вечныя даўгі значацца экзамены па квантавай механіцы, замежнай мове (П. Іваноў), спецкурсу (В. Васільеў).

А зараз дазвольце пазнаёміць вас з рэкардсменамі па колькасці «хвастоў» сярод так званых людзей «з абставінамі». Гэта Генрых Кандахчан і Уладзімір Грэўцаў. У кожнага па тры «хвасты», у тым ліку па педагагічнай практыцы. Калісьці апошні год. За прайшоўшы час прыдбалі, праўда, самастойна, багаты вопыт наконт таго, што датычыць навукі: як адсутнічаць па найбольш верагодных прычынах там, дзе патрэбна быць. Яны па гэтых пытаннях ужо маглі б чытаць свой спецкурс. А іх сябар Уладзімір Чадлідзе, распрацоўваючы гэтую тэму, здолеў бы, напэўна, кіраваць нават кафедрай. Ён — абсалютны рэкардсмен па запазычанасцях: гісторыя філасофіі, агульнае мовазнаўства, спецсемінар, курсавая работа, педагагічная практыка...

Шчыра прызнаюся, не ведаю, што думаюць пра сябе і пра свае адносіны да вучобы людзі «з абставінамі». Мяркую, што нічога благога. І дарма. Бо настойлівую неабходнасць думаць маюць не толькі яны, а яшчэ і некаторыя зацікаўленыя арганізацыі. У сувязі з гэтым працытую думкі апошніх, што датычаць студэнткі чацвёртага курса гістарычнага факультэта А. Мазалеўскай, таксама чалавека «з абставінамі»: «У красавіку 1982 года за акадэмічную непаспяховасць і парушэнне вучэбнай дысцыпліны А. Мазалеўская была адлічана з універсітэта. У чэрвені 1983 года адноўлена на 3-ці курс аддзялення гісторыі. Да вучобы паранейшаму адносілася нядобрасумленна. Па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі мае запазычанасці па трох дысцыплінах. Па грамадска-палітычнай практыцы не атэставана. Заняткі не наведвае: па стану на 6 студзеня гэтага года прапушчана 186 гадзін. Да практычных і семінарскіх заняткаў ніколі не рыхтавалася. Свае абяцанні выправіцца не выконвае... На крытыку не рэагуе... Акадэмічная камісія факультэта 29 лістапада гэтага года прыняла рашэнне адлічыць студэнтку Мазалеўскую А. з універсітэта за акадэмічную запазычанасць і грубае парушэнне вучэбнай дысцыпліны.

Дэканат і грамадскія арганізацыі падтрымліваюць рашэнне акадэмічнай камісіі».

Вось такія абставіны!

Віктар ЧАРНЯЎСКІ.

Лірычна-Іранічны ФакультэТ

СМЕХ — НЕ ГРЭХ!

ПЭЎНА, НІ ПРА адзін сродак, ні пра адны лекі не гавораць столькі і так аднадушна, як пра смех у якасці панацэі ад усіх хвароб і нягод!

Некаторыя нават сцвярджаюць, што сваім існаваннем чалавецтва павінна быць удзячна іменна смеху. Успомніце класічны выраз: «Свет выжыў, таму што смяяўся». Іншыя прышсваюць смеху цудадзейную сілу падаўжаць жыццё. Аўтары гэтай думкі столькі часу правялі за складаннем адпаведных навуковых праспектаў, што калі б столькі смяяліся, то ім даўно было б гарантавана бессмяроцце.

Незалежна ад навуковых распрацовак чалавецтва колькі помніць сябе — смяецца. Мы прапануем вам, паважаныя чытачы, прыняць удзел у гэтай акцыі. Вас запрашае Лірычна-Іранічны ФакультэТ!

Дзяжурыў па ЛІФТу
В. ПЯРУН.

ДОШКА АБ'ЯЎ

ВАМ, БЕЗБІЛЕТНІКІ

Новая форма абслугоўвання пасажыраў грамадскага транспарту ўведзена ў горадзе. Для асоб, якія не жадаюць набываць білеты, спецыяльна курсіруюць некалькі дадатковых аўтобусаў і трамваяў. Кошт праезду ў іх — 2 руб.

БАРАЦЬБА ЗА ЭКАНОМІЮ

У мэтах узмацнення барацьбы за эканомію паперы ў народным тэатры ВНУ адменены тэатральныя праграмы. Прозвішчы выканаўцаў будуць пісацца зараз на спінах персанажаў, аднак; у адрозненне ад хакея, з указаннем званняў.

ДЛЯ ДОМА, ДЛЯ СЯМ'І

Калі вы захапляецеся вырошчваннем хатняй птушкі ў інтэрнацкіх умовах, а ў пакоі няма інкубатара, пакладзіце яйкі на батарэю. Праз 21 дзень з іх вылупяцца свежамарожаныя пісяняты.

ДЫЯЛОГІ

ЭРУДЫЦЫЯ

— Ці купіла ты сваёй дачцэ кнігу «Што павінна ведаць дзяўчына»?

— Купіла.

— Спадабалася?

— Не зусім. Яна выслала аўтару дапаўненні.

АДРОЗНЕННЕ

Студэнт пытае ў прафесара:

— Якое адрозненне паміж разуменнем часу і вечнасці?

— Калі б у мяне быў час растлумачыць гэта, спатрэбілася б цэлая вечнасць, каб вы зразумелі,—адказаў прафесар.

ПАКУТЫ АД ПРЫХІЛЬНАСЦІ

— Вы ўжо трэці раз прыходзіце здаваць мне экзамен!

— Што ў тым дзіўнага? Значыць, гэта мой любімы прадмет.

НА ПОЎНЫМ ДАВЕРЫ

— Чаму ты заўсёды на экзаменах імкнешся адказваць апошнім?

— Я так давяраю экзаменатарам, што абыходжуся без сведак.

ПАСЛЯ СЕСІІ

— Зноў уночы ты размаўляў у сне.

— Цікава: аб чым?

— Аб законах тэрмадынамікі.

— Гэта немагчыма! Я здаў тэрмадынаміку яшчэ пазаўчора.

УСЁ НЕ СТАРЭЕ...

— Твой капялюш зусім як новы!

— Уяві сабе: я купіў яго пяць гадоў назад, калі быў на першым курсе. Тры разы аддаваў у хімчыстку, два разы памяняў у рэстаране, а яму нічога не робіцца.

НУ А ЗАРАЗ?

— Ты чуў, я ўступіў у шлюб?

— Так. А чаму ты гэта зрабіў?

— Вельмі ўжо не падабалася харчавацца ў сталоўцы.

— Ну а зараз?

— Зараз падабаецца.

МОЖНА ПАЗАЙЗДРОСЦІЦЬ

— Калі я быў хлапчуком, я марыў чамусьці стаць піратам, — сказаў адзін прафесар.

— Вам можна пазайздросціць: не кожнаму ўдаецца ажыццявіць мары свайго дзяцінства.

РАЗВАЖЛІВАСЦЬ

— Я буду прасіць аб скасаванні шлюбу. Мая жонка не размаўляе са мной амаль паўгода.

— Адумайся, дзе ты яшчэ знойдзеш такую жонку.

АГУЛЬНАЕ

— Коля, мая сукенка і твая кашуля з адной тканіны.

— А ты казала, што ў нас няма нічога агульнага.

ПЫТАЙЦЕСЯ — АДКАЗВАЕМ

Зуева з... факультэта пытае: «Зараз усюды пішуць аб карысных якасцях змяінага яду. Ці так гэта? Ці карысны змяіны яд на самай справе?»

У размове з нашым карэспандэнтам вядомы таксіколаг, загадчык лабараторыі Навакліоеўскага навукова-даследчага інстытута стымулюючых злучэнняў прыроднага паходжання, член-карэспандэнт, прафесар Серафім Лявонавіч Крапіўкін расказаў:

— Карысны.

ПАРАДЫ

Набыўшы капілку для манет, не забудзьцеся зрабіць у дне адтуліну і заткнуць яе коркам, каб штодня не разбіваць капілку.

СВЯДОМАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

Збольшага рэагуюць на службовыя заўвагі студэнты II курса ...га факультэта. Калі выкладчык зрабіў студэнту два папярэджанні, апошні добраахвотна прапускае адны семінарскія заняткі.

ЗАГАДКІ КАХАННЯ

У групе, дзе займаецца В. Цісі, 24 дзяўчыны. Аднак кветкі і іншыя знакі ўвагі ён дорыць толькі старасту. «Сэрцу не загадаеш»,— тлумачыць гэты парадокс закаханы студэнт.

МУДРАСЦЬ У РОЗНІЦУ

*** Чым бы дзіця ні цешылася, абы дзяцей не заводзіла.**
*** Калі вам нічога не сніцца, значыць, у вас усё ёсць.**
*** Скажы, што ты думаеш пра мяне, і я скажу, хто ты.**
*** Злоўжыванні касметыкай прыводзяць да таго, што ёю даводзіцца часта карыстацца.**
*** Наўрад ці дастаяла б да нашага часу Пізанская вежа, калі б не падала.**
*** На паперы ўсё проста. Калі толькі гэта не падручнік.**
*** Аб сваіх знаёмых ведае ўсё. Але расказаць можа куды болей.**
*** Розум! Добра! Шчасце! Лепш! Ну а сувязі!!**
*** Што не дазволена Юпітэру, тое дазволена прафесару Быкаву І. І.**

Ведае? Не ведае?

Ідзе студэнт па вуліцы на экзамен, мучыцца сумненнямі:

— Ведае?

— Не ведае?

Каля дзвярэй аўдыторыі стаіць, ногі млеюць.

Небарака адказвае прафесару, паглядае адданымі вачыма.

— Ведае?

— Не ведае?

Безнадзейна разглядае сакавітае «незд.» у залікоўцы. Уздыхае:

— Усё ж ведае прафесар, што мяне выперлі са зборнай па футболу.

ЦІКАВА...

◆ Каб кветкі даўжэй стаялі, іх трэба купляць у магазіне «Бытавая хімія».

◆ Каб не сварыцца з цешчай, трэба не жаніцца.

◆ Каб ваш тэлевізар часта не псаваўся, лепш глядзець перадачы ў суседа.

◆ Пабіты посуд вас не так засмуціць, калі гэта здарыцца ў гасцях.

◆ Каб адрозніць карысныя грыбы ад ядавітых, варта паспытаць іх. Ад ядавітых звычайна хутка настае агульная млявасць.

◆ Каб халодны душ не выклікаў прастудных захворванняў, лепш прымаць яго ў думках.

АДНОЙЧЫ...

...Бернард Шоу сустрэўся з чалавекам, які быў вельмі тоўсты. Паглядзеўшы на худога Шоу, таўсцяк зазначыў:

— Вы выглядаеце так, што можна падумаць, нібы Англія галадае.

— А паглядзеўшы на вас, можна падумаць, што вы з'яўляецеся прычынай гэтага бедства.

...Прафесар Антоні Сельфрыдж паявіўся ў лекцыйнай зале горада Мілуакі (ЗША), каб прачытаць лекцыю аб трэніроўцы памяці. Аднак аўдыторыя была пустая. Высветлілася, што прафесар... забыўся, што лекцыю ён сам прызначыў на тыдзень пазней.

— Калі б я мог пачаць жыццё спачатку, я пражыў бы яго гэтак жа.

Мал. Д. Майстрэнка.

Весткі з розных крыніц

УДАР ЛЁСУ

Горкае расчараванне спасцігла студэнта Цялібіна, які ехаў на электрычцы ў Малахоўку. Нягледзячы на тое, што на гэты раз у яго быў білет, кантралёры ў вагоне так і не паявіліся.

НОВАЕ Ў ЗАКОНАХ ФІЗІКІ

У студэнцкім будаўнічым атрадзе «Ветразь» была пераадолена праблема суадноснасці прасторы і часу. Камандзір атрада Царанкін загадаў сваім байцам: «Капаць адсюль і да вечара».

АСНОВЫ КАМБІНАТОРЫКІ

Калі ў тэксце доктарскай дысертацыі дацэнта А. ажыццявіць некаторую колькасць перастановак слоў, то атрымаецца тэкст кандыдацкай дысертацыі яго аспіранта.

ПАДРЫХТОЎКА

«Дарагая матуля, — піша сын маці. — Я праваліўся на экзаменах. Падрыхтуй, калі ласка, тату да гэтай непрыемнай навіны».

«Дарагі сынок, — адказвае маці, — тата падрыхтаваўся. Падрыхтуйся і ты...»

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

Зак. 2017. АТ 10586.

13 снежня 1984 г.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ